# Светлы дзень вызвалення твайго, Беларусь! У Дзень Рэспублікі ў гарадскім пасёлку Воранава ля воінскага захавання прайшоў урачысты мітынг




Кожны народ мае падзеі, якія прадвызначаюць яго гістарычны лёс, выклікаюць у грамадстве высокі духоўны пад’ём, яднаюць усіх яго грамадзян. Для Беларусі такой важнай датай з’яўляецца вызваленне сталіцы нашай дзяржавы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая і стала Днём Незалежнасці. Днём даніны павагі гераічнай доблесці франтавікоў і працаўнікоў тылу, партызан і падпольшчыкаў, якія адстаялі незалежнасць Бацькаўшчыны, у пасляваенныя гады падымалі краіну з руін, мацавалі фундамент яе дабрабыту.


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


40
voran.by voran.by voran.by voran.by


40
voran.by voran.by voran.by voran.by




Сотні жыхароў Воранаўшчыны, у тым ліку прадстаўнікі ўлады, грамадскіх аб’яднанняў, старэйшае пакаленне, моладзь, дзеці, прыйшлі да помніка загінуўшым воінам і партызанам у райцэнтры, каб разам адзначыць Дзень Незалежнасці. Іх з’ядналі агульныя каштоўнасці: гонар за краіну, жаданне працаваць для яе росквіту, любоў да сваёй зямлі, сям’і, родных. І ў 77-ю гадавіну вызвалення Радзімы ад фашысцкай навалы яны не маглі не пакланіцца да зямлі тым, хто здабываў Перамогу.



Пад гукі гімна па флагштоку узняўся ў высь Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Ганаровае права яго падняць было даручана старшыні раённага маладзёжнага парламента Аляксандру Андрушкевічу.




— 3 ліпеня — гэта дзень нашай радасці, памяці і павагі тым, хто быў разам з Беларуссю на складаных этапах яе гісторыі, — звярнулася да прысутных старшыня райсавета дэпутатаў Алена Ганевіч. — Паважаны ветэран Вялікай Айчыннай вайны Сцяпан Аксенцьевіч Жук, ветэраны працы! Вы — пераможцы, вы — наш аўтарытэт. Дзякуй вам за тое, што з'яўляецеся нашым надзейным аплотам і духоўнай апорай.

У гэты святочны дзень мне прыемна адзначыць, што добрасумленная праца, энергія і талент лепшых працаўнікоў нашага раёна — годны працяг традыцый старэйшых пакаленняў. Упэўнена, што наша дзейнасць будзе плённай і ў далейшым. Рухаючыся наперад, ажыццяўляючы задуманае, мы цвёрда ведаем, што падмуркам усіх дасягненняў заўсёды былі і будуць грамадзянскі мір і згода, адзінства ўлады і народа, свабода і незалежнасць краіны. Мы абавязаны зберагчы і прымножыць дасягненні і перадаць свабодную і квітнеючую Беларусь нашым дзецям і ўнукам.




Ад старэйшага пакалення да прысутных звярнулася старшыня раённага савета ветэранаў Людміла Сазон. Паколькі сёння ёсць спробы перапісаць гісторыю Вялікай Айчынна вайны, прынізіць значнасць укладу ў Перамогу савецкага салдата, ветэраны вайны і працы будуць і ў далейшым садзейнічаць выхаванню ў моладзі патрыятызму, адданасці свайму народу, дзяржаве, зазначыла Людміла Канстанцінаўна. У сваю чаргу прадстаўніца моладзі — настаўніца Паляцкішскай сярэдняй школы Анастасія Булаўка — заверыла ўдзельнікаў мітынга, што маладое пакаленне будзе захоўваць традыцыі продкаў, зберагаць мір на роднай зямлі.



Слова ад працоўных калектываў трымала дырэктар Радунскай сярэдняй школы Святлана Пачобут:

— Беларусь сённяшняя — гэта мірная краіна, галоўным багаццем якой быў і застаецца чалавек працы. Сваімі добрымі справамі ва ўсіх сферах жыцця мы захоўваем і памнажаем усё лепшае, што зроблена парярэднімі пакаленнямі. Мы не толькі клапоцімся аб уласным дабрабыце, але і ствараем славу і аўтарытэт сваёй малой радзіме, уносім вялікі ўклад у справу мацавання беларускай дзяржаўнасці, чарговы раз даказваем: эстафета герояў — у надзейных руках.




voran.by voran.by voran.by voran.by


voran.by voran.by voran.by voran.by


voran.by voran.by voran.by voran.by


Дзяржаўная ўстанова культуры
«Воранаўская
раённая бібліятэка»
voran.by voran.by voran.by voran.by

Сапраўды, якое гэта шчасце жыць, тварыць, марыць, працаваць, развівацца ў вольнай краіне! У светлы Дзень Незалежнасці за гэтае права мы павінны сказаць шчырае дзякуй салдатам Перамогі. Тым, хто не вярнуўся дадому, хто склаў галовы ў імя Вызвалення, — Хвіліна маўчання, трохразовы залп з ружжаў, кветкі ля падножжа помніка…

**Марына КАНДРАТОВІЧ.**
**Фота Алега БЕЛЬСКАГА, Сяргея ГРЫЧЫКА.**